# Творчая дзейнасць дзіцяці як аснова работы па прафесіянальнай арыентацыі

***Брылёва Надзея Сяргееўна,***
*педагог дадатковай адукацыі*
*вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Цэнтр дадатковай адукацыі*
*дзяцей і моладзі “Эўрыка” г.Мінска”*

Працуючы з дзецьмі, кожны з нас імкнецца перадаць цікавасць і любоў да сваёй любімай справы. Мы, педагогі, матывіруем дзяцей, ствараем умовы для фарміравання і развіцця дзіцячых талентаў, даём падмурак для станаўлення ўнутранай культуры асобы.

Сістэма дадатковай адукацыі дазваляе пашырыць веды пра творчыя магчымасці навучэнцаў, спрыяе развіццю якасцей, якія важныя для поспеху ў любой сферы дзейнасці.

Для многіх дзетак заняткі ў нашым цэнтры становяцца лёсавызначальнымі. За гады існавання майго калектыву склалася сістэма, якая дае пэўныя вынікі, а гэта значыць, што яна працуе. У яе аснове сумесная творчая дзейнасць дзяцей і педагога, якая ажыццяўляецца ў працэсе разнапланавай работы па вакальнаму накірунку і арыентавана на выхаванне сталай асобы.

Эфектыўнае ўзаемадзеянне педагога з навучэнцамі накіравана на шматбаковыя зносіны. На сваіх занятках я выкарыстоўваю прынцып супрацоўніцтва, партнёрства, які дазваляе не толькі наладзіць эмацыянальны кантакт, але і актывізіраваць дзейнасць дзяцей.

За час працы вакальны калектыў, якім я кірую, паўдзельнічаў у вялікай колькасці разнастайных цікавых праектаў і мерапрыемстваў. Найбольш значныя з іх: праекты “Калядныя казкі”, “Малевіч дзецям”, “Спеўны сход” для дзетак сталіцы, “Святы маёй краіны”, конкурс “Юныя таленты Беларусі”. Асаблівую цікавасць выклікаў праект супрацоўніцтва са студыяй мультыплікацыі “Энфіс” і ўдзел у канцэртных цыклах Белдзяржфілармоніі “Нас яднае хор”.

У сваёй працы я заўсёды шукаю такія падыходы, каб заняткі прыносілі задавальненне і мне, і маім вучням. Разам з навучэнцамі мы знаходзімся ў пастаянным творчым пошуку, вывучаем лепшыя прыклады песеннай спадчыны беларускага народа, паглыбляем свае веды ў галіне нацыянальнай культуры. Гэта дало магчымасць стварыць творчае аб’яднанне “Этналабараторыя”, дзейнасць якой адзначана грантам Мінгарвыканкама.

Галоўнай адметнасцю “Этналабараторыі” з’яўляецца тое, што навучэнцы акрамя знаёмства і вывучэння народных песень, прымаюць актыўны ўдзел у стварэнні новых мадэрнізіраваных апрацовак і пастановак. Сумесна з вучнямі быў створаны зборнік, які складаўся з песень іх бабуль і дзядуль.

На аснове ўсведамлення значнасці традыцыйна народнай песні ў навучэнцаў фарміраваліся каштоўнасныя арыентыры, якія прывялі да таго, што некаторыя дзяўчаты вырашылі звязаць свой лёс з народнай песняй.

Тры мае выпускніцы з’яўляюцца навучэнкамі музычнага каледжа імя Глінкі па спецыяльнасці “Народны хор”. Яны прыйшлі ў наш цэнтр зусім малымі. Дзяўчаты добра вучацца, іх пастаянна запрашаюць да ўдзелу ў самых адказных канцэртах і мерапрыемствах. Я чую шмат удзячных слоў ад іх настаўнікаў з каледжа, ад бацькоў, але, галоўнае, ад іх саміх. Я бачу іх вочы, поўныя радасці і цікавасці, бачу іх саміх, улюбёных у сваю справу. Я ганаруся імі, яны – мая надзея, працяг мяне самой. Часам мы спяваем разам і атрымліваем вялікую асалоду ад сумесных канцэртаў і сустрэч.

Вядома, што не кожны звяжа з музыкай сваё жыццё, не кожнае канцэртнае выступленне ідэальнае, але нашы заняткі сапраўды мяняюць дзетак. Яны па-іншаму пачынаюць успрымаць свет, у сэрцах запальваецца агеньчык любові да мастацтва. Да гэтага далучаецца сцэнічны вопыт, уменне падаць сябе, узняць настрой добрай песняй.

Усім Вам я жадаю натхнення і новых поспехаў! Любіце сваіх дзетак, дзяліцеся з імі ведамі і цяплом, будзьце ім падтрымкай, напаўняйце іх дабрынёй, бо кожны іх дзень – гэта наша будучыня!